DOI:10.17951/sb.2025.19.117-135
Studia Białorutenistyczne 19/2025 LITERARY STUDIES
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Inna Kalita

Belarusian Institute in Prague (The Czech Republic)
e-mail: inna.kalita@belarus-institute.cz
https://orcid.org/0000-0003-0005-1425

# Абразок у святле традыцыі пераемнасці: ад Змітрака Бядулі да Юркі Максімчыка

*"Abrazok" in the Light of the Tradition of Borrowing: from Zmitrok Biadula to Yurka Maksimchyk*

*Obrazki w świetle tradycji ciągłości: od Żmitraka Biaduli do Jurki Maksimczyka*

**Abstract**

The article is devoted to the genre of „abrazok" typical for Belarusian literature, which was formed and became popular in the early 20th century. The research is based on a comprehensive approach and combines comparative-historical, comparative and historical-contextual methods, hermeneutical interpretation. Historical conditions contributed to the gradual replacement of the term „abrazok" by the term „miniature", although the concepts they mean are not absolutely identical. The analysis is focused on the continuity in the tradition of the development of „abrazok" in Belarusian literature: against the background of the classical format of this genre created by Zmitrok Biadula, the most recent examples are examined – the works of the representative of the micro-language of the Western Polesie Aliaksei Dzikavitsky. Dzikavitsky's stylistic techniques in many ways approach the classical models of Z. Biadula. As a result of the development of new spheres of communication in social networks, an internet visual „clone" of the literary „abrazok" – TikTok sketch – was born. The „abrazok" and the sketch share common features: minimalism in content and plot, curiosity, brevity and an emotional component; both types record unforgettable, emotional moments of life and portray them in a certain tone through psychological state of mind. The considered tradition of small-format artwork is a unique Belarusian national product and at the same time it is a part of broader, worldwide tradition of small prose forms.

**Keywords**: genre, „abrazok", miniature, tradition, continuity, TikTok sketch, Zmitrok Biadula, Aliaksei Dzikavitsky, Yurka Maksimchyk

**Abstrakt**

Artykuł został poświęcony ważnemu dla literatury białoruskiej gatunkowi *obrazka*, który ukształtował się i zdobył popularność na początku XX wieku. Badania prowadzone są wieloaspektowo, w oparciu o metody porównawczo-historyczne, porównawcze, historyczno-kontekstualne oraz interpretację hermeneutyczną. Uwarunkowania historyczne sprzyjały stopniowemu zastępowaniu terminu *obrazek* terminem *miniatura*, choć pojęcia te nie są w pełni tożsame. W analizie szczególny nacisk położono na ciągłość tradycji rozwoju białoruskiego obrazka: na tle klasycznego formatu gatunku, stworzonego przez Zmitroka Biadulę, omówiono także najnowsze przykłady – utwory Aliaksieja Dzikawickiego, reprezentanta mikrojęzyka zachodniopoleskiego. Metody stylistyczne Dzikawickiego w wielu aspektach pozostają bliskie klasycznym wzorcom Biaduli. Rozwój nowych form komunikacji w mediach społecznościowych doprowadził do powstania w Internecie wizualnego „klonu" literackiego obrazka – skeczu TikTok. Oba gatunki łączy objętościowy i fabularny minimalizm, zwięzłość, element emocjonalny, a także tendencja do utrwalania wspomnieniowych i uczuciowych momentów życia oraz odzwierciedlania ich w formie szkicu o wyrazistym nastroju psychologicznym. Przedstawiona w artykule tradycja małoformatowego utworu literackiego stanowi unikalny produkt białoruskiej kultury narodowej, a zarazem element szerszej, światowej tradycji małych form prozatorskich.

**Słowa kluczowe**: gatunek literacki, obrazek, miniatura, tradycja, ciągłość, skecz TikTok, Zmitrok Biadula, Aliaksiej Dzikawicki, Jurka Maksimczyk

**Анатацыя**

Артыкул прысвечаны знакаваму для беларускай літаратуры жанру *абразка*, які аформіўся і набыў папулярнасць на пачатку XX ст. Даследаванне заснавана на комплексным падыходзе і спалучае параўнальна-гістарычны, кампаратыўны і гісторыка-кантэкстуальны метады, герменеўтычную інтэрпрэтацыю. Гістарычныя ўмовы садзейнічалі паступовай замене тэрміну *абразок* тэрмінам *мініяцюра*, хаця азначаемыя імі паняцці не абсалютна тоесныя. Аналіз сфакусаваны на пераемнасці ў развіцці беларускага абразка: на фоне класічнага фармату гэтага жанра, створанага Змітраком Бядулем, разглядаюцца навейшыя прыклады – творы Аляксея Дзікавіцкага, прадстаўніка заходнепалескай мікрамовы. Стылёвыя прыёмы Дзікавіцкага шмат у чым набліжаюцца да класічных узораў З. Бядулі. У выніку развіцця новых камунікатыўных сфер у сацыяльных сетках, узнікае інтэрнэтавы візуальны „клон" літаратурнага абразка – ЦікТок скетч. Абразок і скетч маюць агульныя паказчыкі: абсягавы і сюжэтны мінімалізм, цікавостка, лаканічнасць, эмацыйны складнік, абодва фіксуюць запамінальныя, пачуццёвыя моманты жыцця і адлюстроўваюць іх у пэўнай замалёўцы праз псіхалагічны настрой. Разгледжаная традыцыя малафарматнага мастацкага твора з'яўляецца ўнікальным беларускім нацыянальным прадуктам, адначасова – складнікам больш шырокай, агульнасветавай традыцыі малых празаічных форм.

**Ключавыя словы**: жанр, абразок, мініяцюра, традыцыя, пераемнасць, ЦікТок-скетч, Змітрок Бядуля, Аляксей Дзікавіцкі, Юрка Максімчык

## Уступ

Для беларускай літаратуры абразок – знакавы жанр, менавіта з ім звязаныя пачаткі нацыянальнай літаратуры. Абразок аформіўся і набыў папулярнасць на пачатку ХХ ст., сустрэнем яго ў творчасці Якуба Коласа і Ядвігіна Ш., Цёткі і Сяргея Палуяна. Найбольш актыўным стваральнікам абразкоў быў Змітрок Бядуля, яго кніга *Абразкі* (1913) зафіксавала і назву малога празаічнага жанру, і факт яго афармлення ў беларускай літаратуры. Для многіх пісьменнікаў Бядуля стаў узорам і натхняльнікам у стварэнні абразкоў. Колас прысвяціў Бядулю свой абразок *Кучаравае дрэва*. Пра Бядулеў уплыў пісаў і Янка Брыль:

> [...] сімпатычны ён мне, гэты дзіўны беларускі яўрэй, амаль з маленства, ад хрэстаматыйнай «Малітвы малога Габрусіка» і «Абразкоў», якія я палюбіў увосень 1932 года, калі «пасля навукі» пайшоў у працу. Нават верш тады напісаў пераймальны, паводле імпрэсіі «Бяссоннасць» (Bryl′, 1981, I);
>
> Набядуліўся да пачатку пятай гадзіны. Пасля «Абразкоў» – апавяданні пайшлі цікавей (Bryl′, 1997, I).

У другой палове ХХ ст. жанр абразка ўдала распрацоўваў “памежны” пісьменнік з Падляшша Сакрат Яновіч, яго абразкі выходзілі па-польску і па-беларуску ў кнігах *Загоны* (1969), *Wielkie miasto Białystok* (1973), *Zapomnieliska* (1978), *Małe dni* (1981) і інш. Праз шэсць дзесяцігоддзяў пасля выхаду Бядулевых абразкоў выйшла аднайменная кніга Фёдара Янкоўскага *Абразкі* (1975). Звярталіся да гэтага жанру і беларускія класікі сярэдзіны і другой паловы ХХ ст. – Барыс Сачанка, Аляксей Карпюк, Міхась Стральцоў, Янка Брыль і інш. На працягу свайго развіцця беларуская літаратура назапасіла вялікі багаж разнастайных абразкоў, які працягваюць папаўняць сучаснікі: Альжбета Кеда, Ганна Атрошчанка, Расціслаў Бензярук, Міхась Пазнякоў і інш. Класічныя ўзоры абразкоў былі аналізаваныя літаратуразнаўцамі ў мінулым стагоддзі, але і сучасны абразок заслугоўвае ўвагі і параўнанняў з дасюль назапашаным арсеналам.

Абразок непарыўна звязаны з кантэкстам, часам свайго ўзнікнення, а дакладней – момантам. Розныя формы малафарматных тэкстаў са з’яўленнем інтэрнэту пераходзяць у медыяпрастору, інтэрнэт-камунікацыя “пераплаўляе” іх у новыя тыпы мікратэкстаў.

> Жанр миниатюры, «фрагмента», который в виртуальном пространстве коммуникации трансформировался в интернет-post, не случайно, а закономерно поднят на щит в наше время, общество (в том числе и в своем виртуальном эквиваленте – совокупность пользователей сети) фактически открыто заявляет о спросе на лаконичные, емкие, яркие, афористичные, личностно окрашенные изъявления «жизни души» (Lebedeva, 2017, s. 115).

Імкненне да малафарматнасці і лаканічнасці – агульнасветавы сучасны трэнд. Філосаф і філолаг Міхаіл Эпштэйн лічыць:

> В эпоху, перенасыщенную информацией, важно её концентрировать в сжатых текстах. Есть разные жанры мини-прозы. Например, «flash–fiction» (от английского слова «вспышка») – рассказы до 1000 слов. Есть «микропроза» – до 300 слов. Есть короткие жанры строго определенного размера, например, драббл (drabble) – произведения, состоящие ровно из 100 слов, или дриббл (dribble) – ровно из 50. Но есть и ещё меньшие жанрообразующие размеры, которые, пользуясь суффиксальными и префиксальными возможностями русского языка, можно, по контрасту с «рассказом», назвать: рассказец (до 100 слов), рассказик (до 50), микро-рассказ (до 20), нано-рассказ (до 10), рассказ-квант (до 5) (Èpštejn, 2024, I).

Наша мэта – сфармуляваць дэфініцыю абразка, разгледзеўшы яго на фоне іншых малафарматных мастацкіх тэкстаў (жанр дагэтуль застаецца тэарэтычна нераспрацаваным) і прасачыць сучасныя тэндэнцыі ў яго развіцці. Аналіз будзе сфакусаваны на некалькі важных аспектаў: (1) назва жанра і яе пераменлівы лёс; (2) пераемнасць у развіцці жанру беларускага абразка; (3) навейшыя абразкі, якія не з’яўляюцца ўласна беларускімі тэкстамі, але цесна знітаваныя з этнакультурным полем Беларусі – творы Аляксея Дзікавіцкага, які развівае традыцыю заходнепалескай літаратурнай мікрамовы, скіроўваючы „фокус” на этнакультурную ідэнтычнасць; (4) новыя, нелітаратурныя формы абразка – цікток-скетчы. Таксама параўнаем агульныя рысы традыцыйнага абразка, як першакрыніцы з яго інтэрнэтавым „клонам” – скетчам у ЦікТоку.

Даследаванне заснавана на комплексным падыходзе і спалучае параўнальна-гістарычны, кампаратыўны і гісторыка-кантэкстуальны метады, герменеўтычную інтэрпрэтацыю.

## 1. Абразок у беларускай літаратуры – да праблемы тэрміналогіі

Пачатак XX ст. прынёс у культурную прастору Беларусі моду на *абразок,* не толькі на малафарматны мастацкі тэкст, але перш за ўсё на само слова. Абразкамі ў першай трэці XX ст. у беларускім літаратурным і газетным асяроддзі называлі любыя невялікія тэксты, якія маглі прэтэндаваць на мастацкую вартасць. Аналагічная мода назіралася крыху раней у польскай літаратуры – ад 1840-х да 1920-х гадоў. Польская лічбавая бібліятэка POLONA (https://polona.pl/) утрымлівае звыш дзвюх тысяч пісьмовых і друкаваных пазіцый у прамежку ад 1839 па 1900 г., і звыш 600 пазіцый у прамежку з 1900 па 1920 г., у назвах якіх ёсць слова *obrazki.* Гэта творы рознага гатунку, ад апісанняў жывёл, птушак і іншых краін (*Obrazy i obrazki Indji* Stanisława Bełza,

*Obrazki amerykańskie* Stefana Barszczewskiego) да living рознатэматычных мастацкіх твораў: абразкі сямейныя, польскія, рэвалюцыйныя, паляўнічыя, катаржныя (абразкі сібірскія) і г.д. У такой значнай колькасці кніг назва *obrazki* не азначае жанр, а хутчэй сведчыць пра імкненне аўтараў падаць матэрыял "літаратурна". Такая ж тэндэнцыя назіраецца ў беларускай літаратуры пачатку XX ст. Таму, разглядаючы літаратуру той пары, трэба размяжоўваць выкарыстанне гэтага слова паводле двух крытэрыяў: *індывідуальна-аўтарскага* ўжывання і *тэрміналагічнага* – жанравызначальнага. Тэрмін *абразок* азначае *кароткі празаічны жанр*. Калі слова ўжыта ў якасці аўтарскай назвы, як напрыклад, *Сібірскія абразкі* (1926–1928) Максіма Гарэцкага – гэта толькі назва цыклу падарожных занатовак, а не жанр аб'яднаных у ім твораў. Пераважная большасць тэкстаў гэтага незавершанага цыклу мае дакументальны характар і толькі некалькі з іх можна назваць абразкамі. Індывідуальна-аўтарскімі з'яўляюцца назвы шматлікіх кароткіх п'ес таго часу, якія па-моднаму называліся абразкамі, як напрыклад *На вёсцы: ідылічны абразок у 2 актах* Францішка Аляхновіча (1919), драматычны абразок *Антон Лата* Тараса Гушчы (Я. Колас), *На папасе: абразок з 1906 года* Янкі Купалы. Крыніцы пачатку XX ст. паказваюць, што вольнае найменне розных тыпаў тэкстаў было вельмі распаўсюджанай з'явай.

У якасці сіноніма да *абразка* ў значэнні жанру ўжываюцца таксама *імпрэсія*, *лірычныя імпрэсіі* і *вершы ў прозе*. *Тлумачальны слоўнік беларускай мовы* дае наступныя тлумачэнні гэтых слоў:

> імпрэсія, -і, ж. р.
> 1. Суб'ектыўнае адчуванне, перажыванне; мімалётнае ўражанне, настрой.
> 2. Кароткі літаратурны твор эмацыянальна-суб'ектыўнага характару. Імпрэсія ў прозе. [Лац. impressio.] (Tlumačal′ny sloŭnìk, 1978, s. 540).
> Верш у прозе – кароткі паэтычны твор, напісаны ў празаічнай форме (Tlumačal′ny sloŭnìk, 1977, s. 481).

Паводле Вячаслава Рагойшы, у літаратурнай крытыцы часта блытаюцца паняцці *версэт* і *вершы ў прозе*, версэты не зусім правільна называюць вершам у прозе, „паколькі ў самім гэтым словазлучэнні два паняцці (верш і проза) узаемна выключаюць адно другое" (Ragojša, 2009, s. 33).

> Версэт / франц. verset / – невялікі твор, паэтычны па змесце і празаічны па форме выяўлення гэтага зместу. У ім няма вершаванага рытму, метра і рыфмы. У той жа час яму характэрныя многія іншыя прыкметы паэтычнага выказвання – у змесце (матывы, ідэі, вобразы тыя ж, што і ў паэзіі адпаведнага перыяду), агульнай лірычна-суб'ектыўнай танальнасці, паэтычнай вобразнасці (канцэнтрацыя тропаў, павышэнне асацыятыўнай сувязі паміж асобнымі словамі і рэаліямі), сінтаксісе (шматлікасць разнастайных паўтораў, зваротаў, недасказаў і г. д.), кампазіцыі (невялікі памер, падзел

твора на дробныя абзацы, т. зв. страфемы , што нагадваюць строфы ў звычайным вершы, адсутнасць сюжэта) (Ragojša, 2009, s. 33).

Узнікненне версэтаў ў беларускай літаратуры В. Рагойша адносіць да пачатку XX ст. і залічвае да іх *Думкі ў дарозе* Я. Коласа, *Васількі* і *Раны* Ядвігіна Ш., *Стогны душы* М. Гарэцкага, *Плач пралесак* і *Пяюць начлежнікі* З. Бядулі – творы, якія адны крытыкі называюць абразкамі, іншыя – імпрэсіяімі ці лірычнымі імпрэсіямі, або вершамі ў прозе. Крытык адзначае, што версэты адразу набылі рэфлексійнасць, філасофскую заглыбленасць і сацыяльную скіраванасць. Дзве першыя рысы цалкам карэлююць з характарам абразка, але сацыяльная накіраванасць для абразка – з'ява факультатыўная.

Знак роўнасці паміж імпрэсіяй і абразком ставяць Канстанцыя Буйло, Уладзімір Карпаў і Ян Скрыган, *апавяданнямі-імпрэсіямі* называе абразкі Віталь Вольскі (Volʹskì, 1966, s. 92). У той жа час *імпрэсіямі* называюць і вершы З. Бядулі ранняга перыяду (Sadko, 2022, s. 100), якія паводле Юліі Дворкінай, характарызуюцца рытмічнай разнастайцасцю і пераклікаюцца з настроямі абразкоў Бядулі, з той розніцай, што абразкі „значна больш песімістычныя, тут ужо часта прабіваюцца думкі філасофскага скептыцызма, неўпэўненасці ў рэальнасці жыцця, сумнення ў здольнасці чалавека зразумець сутнасць жыцця" (Dvorkìna, 1940, s. 25).

У той час, як у іншых славянскіх літаратурах вельмі хутка запанаваў тэрмін *мініяцюра* ў дачыненні да падобных кароткіх тэкстаў, у беларускай літаратуры пачатку XX ст. слова *абразок* набрыняла своеасаблівым кананічным сэнсам (усе астатнія вышэйпералічаныя тэрміны з'явіліся пазней). Слова *абразок*, як і самі малафарматныя тэксты, стала люстэркам новай эпохі. Абразок узнік і стаў запатрабаваным у той час, калі чытацкая аўдыторыя ў сваёй масе была „пачуццёвай" і "непадрыхтаванай" для ўспрымання вялікіх тэкстаў. Пераважная колькасць носьбітаў беларускіх гаворак на пачатку XX ст. была непісьменнай і толькі пачынала авалодваць граматай. У такіх умовах абразок быў найбольш прыдатнай літаратурнай формай, якая здзейсніла і ўласна літаратурную функцыю эстэтычнага задаволення, і функцыю прыцягнення ўвагі да мастацкай літаратуры. Гэтаму не ў малой меры спрыяў і той факт, што абразкі ў той час друкаваліся ў газетах, у прыватнасці ў адным з найбольш папулярных медыйных выданняў „Нашай Ніве". Абразок занатоўваў тое, што кранала душу чытача, а кароткі тэкст „не напружваў" малаадукаванага чалавека.

У другой палове XX ст. абразок пачалі атаясамліваць з вельмі шырокім тэрмінам *мініяцюра*, які ў савецкім літаратуразнаўстве склаўся сто гадоў таму.

Миниатюра – литературный термин, заимствованный из живописи. В живописи означает исполненную красками небольших размеров картинку, книжную заставку, концовку и т. п. Происходит этот термин от слова «миниум» – название красной краски (киновари или сурика), которая была в употреблении у старинных мастеров миниатюры.

> По аналогии с произведениями живописи, термин «миниатюра» применяется и к произведениям художественного слова: как и в живописи, первой характеризующей чертой миниатюры – литературного произведения служат ее небольшие размеры: 5–10 страниц – предел, редко превышаемый (Dynnik, 1925, s. 443–444).

Аб'ём мініяцюры адносіцца да крытэрыяў дыскутабельных, і на нашу думку –ставіць мяжу паміж шырокім азначэннем мініяцюры і ўласна абразком. Украінская літаратуразнаўца Олена Гінда лічыць, што абсяг мініяцюры можа быць ад некалькіх радкоў тэксту да некалькіх старонак (Ginda, 1999, s. 111), як і астатнія даследчыкі, яна не называе канкрэтную колькасць старонак. Сучасная ўкраінская крытыка поруч з *мініяцюрай* выкарыстоўвае тэрмін *прозова мініатюра*, знакаміты літаратуразнаўца мінулага стагоддзя Васіль Фашчэнка родавым паняццем сціслых форм эпасу лічыў *навелістыку* і залічваў да яе „*образок, шкіц, новелу, оповідання, етюд і т. п.*” (Faŝenko, 2005, s. 183). У чэшскім літаратуразнаўстве паралельна ўжываюцца тэрміны мініяцюра (*miniatura*) і кароткія прозы (*krátké prózy*), пад шырокім брылём якіх, таксама як і ў расійскай крытыцы, „хаваюцца” вельмі розныя творы.

Неабходна закрануць пытанне – чаму тэрмін *абразок* у беларускім літаратуразнаўстве паступова выходзіў з ужытку і ў наш час мае няўстойлівую пазіцыю. Дзве асноўныя прычыны гэтага працэсу абумоўлены гістарычна. Па-першае, пачатак XX ст. – час фармавання новай беларускай літаратуры, калі і беларускае літаратуразнаўства знаходзілася ў зародкавым стане. Мікалай Хаустовіч адзначае, што крокі ў кірунку стварэння навуковай гісторыі беларускай літаратуры пачаліся ў сярэдзіне 1920-х гг. і былі адно спробамі ахарактарызаваць літаратурны працэс мінулага (Haŭstovìč, 2018, s. 5), а пасля рэпрэсій 1930-х гг. тэксталогія як навука „знікла” (Haŭstovìč, 2018, s. 9), але і ў пасляваенны час стан беларускага гістарычнага літаратуразнаўства заставаўся катастрафічным (Haŭstovìč, 2018, s. 10). Зразумела, што ў такіх умовах займацца аналізам стану тагачаснага літпрацэсу было немагчыма. Па-другое, беларусізацыя 1920-х – пачатку 1930-х гг. была эпохай стварэння слоўнікаў – эпохай пладатворнай, але надзвычай кароткай, таму навуковая праца не змагла разгарнуцца напоўніцу і вялікі пласт беларускай лексікі застаўся незафіксаваным у слоўніках, такі ж лёс напаткаў слова *абразок*. Ян Скрыган неаднаразова з прыкрасцю адзначаў, што ўся наша літаратура карысталася і карыстаецца словам „абразкі” – „своеасаблівым нацыянальным вызначэннем жанру, але ў слоўніку яно адсутнічае” (Skrygan, 1985, I). Да абразкоў у Скрыгана было асаблівае стаўленне, у сваім лісце да Уладзіміра Ягоўдзіка ён пісаў:

> Дарагі Валодзя! Адразу ж, прачытаўшы твае кароткія апавяданні ў «ЛіМе» – «Шчыраю ноччу» і «Вузел» – (хочацца назваць іх вельмі добрым і мяккім словам «Абразкі», якога, на вялікі жаль, Тлумачальны слоўнік не палічыў патрэбным ужо нават упомніць).

> [...] Душэўныя, лірычна-роздумныя, напісаныя скупа, тонка і далікатна, без вымудраў і штучнага прыхарошвання, яны робяцца з'яваю сапраўднае літаратуры (Skrygan, 1981, I).

У час усеахопнай русіфікацыі – 1960–1970-я гг. ў беларускай літаратуры назіраецца крэн да ўжывання тэрміну *мініяцюра*, які хутка замяняе *абразок*. Мініяцюрамі называе свае творы Я. Брыль: „І ўсё-такі ў сваіх мініяцюрах я адчуваюся найбольш самім сабою. І вось чакаю кнігі з імі, сабранымі і прасеянымі, як чагосьці новага і найважнейшага ва ўсім, што я рабіў і раблю” (Bryl′, 1981, I). Таму цалкам лагічным працягам выглядае ўжыванне гэтага тэрміну наступнымі пакаленнямі літаратуразнаўцаў (гл. Kìslìcyna, 2000, Kazloǔskì, 2008, Sìvèk, 2003). Варта прыгадаць выказаны амаль 50 гадоў таму погляд Уладзіміра Калесніка.

> Мініяцюры зусім не падобны на традыцыйнае паняцце «жанр», пад якім разумеецца тып і спосаб арганізацыі зместу ў мастацкім творы. Жанр – гэта ўстойлівасць структуры твора, якая адпавядае ўстойлівым поглядам на рэчаіснасць як на працэс, які развіваецца лагічна, паслядоўна, заканамерна. Дыялектычная рэлятыўнасць жыццёвага патоку і мажлівыя выпадковасці ў такім выпадку астаюцца па-за вобразам. Мініяцюра ў кантэксце гэтых разважанняў магла б трактавацца як антыжанр, гэта значыць, як структура, якая падкрэслівае зменлівасць плыні жыцця, працэс, які дзеецца ў сутыкненнях супярэчлівасцей, узаемным пранікненні заканамернага і выпадковага, бясспрэчнага і спрэчнага, аб'ектыўнага і суб'ектыўнага.
>
> Калі кожная канкрэтная мініяцюра – антыжанр, дык цыкл мініяцюр – затое ўжо жанр, блізкі да традыцыйнага разумення. Цыклы мініяцюр і кніга мініяцюр – гэта як бы жывы эпас сучаснасці, які схоплівае жыццё як рух гуманістычна зараджаных часцінак сярод нейтральнага, незапоўненага прастору (Kalesnìk, 1975, s. 217–218).

У. Калеснік апісвае „мініяцюрны свет” Я. Брыля, які насамрэч арганічна выглядае ў сваім комплексным афармленні – цыклу, і значна адрозніваецца ад стылю Бядулі. Таму думка У. Калесніка аб няўстойлівасці структуры мініяцюр слушная, нездарма ж і рускаму пісьменніку Віктару Астаф'еву тэрмін мініяцюра здаваўся недастатковым, для азначэння спецыфікі сваіх тэкстаў ён ужываў уласна-аўтарскае найменне „затеси”, прымарнае значэнне якога не звязана са сферай літаратуры, але апасродкавана цалкам лагічна падводзіць да разумення фармавання першых этапаў любой нацыянальнай літаратуры ці шляху пісьменніка ў літаратуру:

> Затесь – сама по себе вещь древняя и всем ведомая – это стёс, сделанный на дереве топором или другим каким острым предметом. Делали его первопроходцы и таежники для того, чтобы белеющая на стволе дерева мета была видна издалека, и ходили по тайге от меты к мете, часто здесь получалась тропа, затем и дорога, и где-то в конце ее возникало зимовье, заимка, затем село и город (Astaf′ev, 2008, I).

Мяжа ў вызначэнні жанру насамрэч вельмі крохкая – гэту думку на розных мовах выказваюць даследчыкі мініяцюрных жанраў розных нацыянальных традыцый, бо абразкі і мініяцюры – надзвычай унутраныя аўтарскія „прамовы”. Абразкі аўтараў малодшага ўзросту часцей адлюстроўваюць эмоцыі захаплення прыродай, прыгажосцю, закаханасць, у старэйшых аўтараў яны звязаны з успамінамі і асэнсаваннем свайго дзяцінства і перажытых эмоцый, у больш сталым узросце ярка праяўляецца спавядальнасць, рэтраспектыўнасць, таму тэксты гэтых жанраў, напісаныя рознымі аўтарамі, могуць значна адрозніваццa.

## 2. Беларускі абразок як жанр

Узорам жанру абразка мы лічым абразкі З. Бядулі, а самога Бядулю – заснавальнікам гэтага жанру, у адрозненні ад Беаты Сівэк, якая першастваральнікам беларускага абразка называе Якуба Коласа (Sìvèk, 2003, s. 131). Бядуля быў адным з першых, але безумоўна, не першым, хто пачаў пісаць абразкі па-беларуску. І сам Колас з захапленнем пісаў пра Бядулю, і пра ягоныя абразкі. Але ў гэтым кантэксце варта падкрэсліць, што абразок набывае вартасць і афармляецца жанрава ў цесным „суседстве” з іншымі абразкамі, у адным агульным выданні, а цэласны збор малафарматных лірычных тэкстаў з такой назвай належыць менавіта Змітраку Бядулю.

Абразок у параўнанні з мініяцюрай – з’ява больш вузкая, мінімалістычная, мікраскапічная. У свой час З. Бядуля аформіў і абсягавыя межы абразка – ад некалькіх сказаў да старонкі, большасць яго абразкоў – паўстаронкавыя тэксты. Безумоўна, нельга „абрэзаць” абразок колькасцю знакаў, якія зоймуць дакладна адну старонку, але 3-х ці 5-ці старонкавы тэкст – гэта мініяцюра ў шырокім разуменні, але не абразок. Не лічым абразкамі і падзеявыя творы, такія як п’есы.

Падрабязна аформленая замалёўка, на якую накладзена шмат фарбаў і дэталяў, ператвараецца ў карціну, так і з літаратурным абразком, калі „удасканаліць” яго апісаннямі і выразнымі колерамі, знікне адчуванне імгненнасці і хуткаплыннасці яго пачуццёвых нот, ледзь улоўныя павевы душы аформяцца ў сфармуляваныя думкі.

Абразок – найкарацейшы жанр мастацкай прозы абсягам ад некалькіх сказаў да адной старонкі, гэта мікраскапічная мініяцюра з няўстойлівай структурай і пэўнай доляй недафармуляванасці і няўлоўнасці асобных рыс ці дзеянняў. Абразок ствараецца як псіхалагічная рэфлексія, занатоўка моманту ці сітуацыі, імгненны зрэз падзеі, штрыхі да душэўнага стану чалавека. Абразок выглядае як эмбрыён вялікага мастацкага твора, але такая форма для абразка з’яўляецца самадастатковай. Суадносіны мініяцюры і абразка можна сфармуляваць так: кожны абразок з’яўляецца мінімалістычнай мініяцюрай, але не кожная мініяцюра з’яўляецца абразком.

Абразок можа мець сюжэтную канву, гэта аб'ядноўвае яго з апавяданнем, але ў апавяданні сюжэтная лінія завяршаецца, а абразок не патрабуе завершанасці сюжэту, пры адсутнасці актыўнага дзеяння абразок вымагае наяўнасці пазнавальных сімвалаў. Большая вага належыць менавіта нутранаму сімвалу, а не завершанаму сюжэту. Абразок – своеасаблівы „недаладаваны", „недамаляваны" матыў, інакш кажучы, каштоўнасць абразка – у яго нефатаграфічнасці. Абразок – не актыўны падзеявы твор, аўтар „намацвае" і адлюстроўвае абрысы ўспрымання праз „заслону" эмоцый, думак, якія ўтвараюць апору кароткага тэксту з глыбокім пачуццёвым абсягам. Дынаміка дзеяння ў абразку запаволеная, часта – рэтраспектыўна-эмацыйная – як погляд здалёк, з мінулага, з іншай перспектывы. Абразок З. Бядулі *А можа, і праўда?..* складзены са сказаў разгорнутай структуры, якія ўтрымліваюць дзеясловы дзеяння, але ад самага пачатку названае імі дзеянне ставіцца пад сумнеў і становіцца гіпатэтычным. Пытанне "А можа, і праўда?" нівелюе дзеянне, дынаміка якога „стаіць на спуску", спуск магчымы, але чытач не ведае, ці адбыўся ён:

> А можа, і праўда, што пурпур над зарасляй рассыпае нейкая таемная багіня хмар?
> А можа, і праўда, што кожную кветачку анёл фарбуе і салоўка песціць?
> А можа, і праўда, што сэрца маё нейкая парваная струна, каторай калісь-то кранулiся кволыя пальцы дзяўчыны прыгожай?..
> А можа, і праўда, што жыццё маё, гэта нейкая цудная мара паўночы, каторая знікне, чуць толькі першы певень запяе?..
> А можа, і праўда, што ў пажарышчы тваіх ясных вачэй палаюць замчышчы нейкіх старасвецкіх казак, каторыя варожаць салодкім шопатам сваім?..
> Лес маўчыць і нічога не кажа; чарот у завадзі шуміць ды гэтаксама мала чаго гаворыць. Зоркі на мігі сваю гутарку вядуць... (Bâdulâ, 1986, I).

Бядулеў абразок *Пяюць начлежнікі* пачынаецца словамі „*...Пяюць начлежнікі... Слоў не разбярэш – надта закацістая песня, але зірнеш, адкуль плыве яна, і ўбачыш чырвоны слуп з чорнай каронай над лесам – гэта вогнішча начлежнікаў...*" (Bâdulâ, 1986, s. 5). І тут дзеянне „пяюць" аўтар „сцішае" адлегласцю, праз якую *слоў не разабраць.* Актуальны сімвал – песня падаецца як „макраздымак", дзе песня аднačасова ёсць і праблемай і высновай:

> Якая моцная падмога ідзе ад цябе, шчырая святая песня!.. Нудным і вясёлым часам ты заглядаеш у нашы душы! [...] Шчыры напевы іх і поўны задумы, як цёмнае неба, каторае навісла над імі; як белыя туманы над рэчкай атуляюць яны душу тваю, і на клік гэтай песні звіняць струны твайго сэрца, а ў вачах слёзы блішчаць... (Bâdulâ, 1986, I).

Хрэстаматыйныя творы Бядулі шмат у чым узорныя, таму іх вобразы становяцца сімваламі абразкоў сучасных, як напрыклад, у *Шчонаўскіх абразках* Альжбеты Кеды.

> Прыйшла яна аднойчы да суседкі, што праз балота жыла. [...] А ў суседкі – поўныя ночвы апенькаў з варанчанскага лесу. І так захацелася Вольцы тых грыбоў! Але вядомы сюжэт з беларускае нашаніўскае класікі пра пяць лыжак заціркі не паўтарыўся. Хоць трагізмам, як у Змітрака Бядулі, ён бы не набрыняў, бо, як казала пасля Волька ўнучцы, колькі ёй тых грыбоў трэба было б, ну са жменю якую, а ў іх жа цэлыя ночвы. І глядзела на ласунак зразумелым позіркам, і хваліла, і распытала, што будуць з імі рабіць, ды суседка «не зразумела», што так абыходзіць беднай Барэйчысе. Але гонару гарушчая ўдава не страціла: не папрасіла. Ішла дахаты пакрыўджаная і абражаная «нездагадліваю» скупою кабетаю. «І такая крыўда мяне ўзяла, так мне кепско было, што, здэцца, свет няміла. Адно ж бачу: на купіне сярод балота – апенькі. Далібог, не было іх, як туды ішла. Гэто Божанька мне іх паслаў (яшчэ адзін падкарэктаваны класічны сюжэт), бо бачыў, як мне грыбоў захацеласё. Бог усё ведая!» (Kjeda, 2017, s. 10).

А. Кеда дэталёва прапрацоўвае свае абразкі, таму яны набліжаюцца да апавяданняў, але аўтарка паслядоўна развівае адну з асноўных канстант абразка – пачуццёвасць, якая і ўтрымлівае яе тэксты ў межах аналізаванага жанру.

## 3. Абразкі Аляксея Дзікавіцкага

Да жанру абразка Аляксей Дзікавіцкі звярнуўся ў сваёй першай кнізе *Оньдэ* (2021). Абразкі А. Дзікавіцкага – бытавыя і алегарычныя, лірычныя і сатырычныя. Часта будзённая сітуацыя становіцца асновай для сатыры, аўтар змешвае звычайнае і незвычайнае ва ўспрыманні прадстаўнікоў розных культур і пакаленняў.

> Було колысь, шчо швэды чэрэз сэло йіхалы, ды коло нашойі хаты сталы. Выходять, фотографырують. Мні не шкода, яснэ діло, але дай думаю, спытаюся, шчо воны побачылы тут такого, а можэ карточку пэрэслалі б... Пэрэводчык і кажэ, шчо колёр хата моя такый нэзвычайный мае. От дыво! Якы шчэ колёр? Ну і пытаютса в мэнэ проз того пэрэводчыка, як я таку фарбу зробыв, чы нэ художнык я якый? Ха-ха-ха... А я ім і одказваю: якый там художнык, за Советув тяжко було тую фарбу купыты пуд достатком... то вырвэш дэ по блату пару банок, вытягнэш з шопы ныколышню, шчо осталася з того разу, шчэ сэстра дасть яку стару, змэшаеш, коб хопыло, пофарбыш – і от тобі – колёр! Ну то швэды головамі трасуть, охкають, шчо дякуючы мні тэпэр оно зрозумілы, чому в нас, і на Украіні тут рядом, хаты такыйі колёры мають (Dykovycʹkyj, 2021, s. 19).

Аўтар фіксуе рэшткі падзей, выкліканыя ўспамінамі, але не разгортвае сюжэт, дае толькі яго агульныя рысы. Больш выразная роля належыць дэталям, штрыхам, эмацыйнаму фону і прыхаваным пачуццям. Абразкі А. Дзікавіцкага не маюць

уласных назваў, іх „працоўным фонам” выступае палеская вёска, а ідэятворчымі асобамі – вяскоўцы, якія дзеляцца сваімі назіраннямі і разважаннямі. Кароткія тэксты з шырокім спектрам эмоцый і разваг гавораць пра дальнабачнасць простага чалавека ў розных жыццёвых сітуацыях, змяшчаюць назіранні над прычынамі складанасцяў чалавечых адносін. У звычайных сітуацыях часта выяўляюцца глыбокія філасофскія думкі і традыцыйнае палескае разуменне прыстойнасці ў паводзінах чалавека.

Ты часто в дорозі, Алёша, так жэ ж? Дорога, особліво далэка, гэто справа сур'ёзна. Люды думають, шчо от йідэ чоловік, то ныц нэ робыть, картоплі ж не копае ... Але тяжка гэто доля – дорога. Я тобі так скажу, шчо в дорогу нэльзя ныяк забутыся грэбня, брытву, мыло з помазком, рубашку запасну, одеколон, носувку і трапочку яку, коб туфлі якшчо протэрты. [...] Як гэто будэш міты, то всегда выглядатымэш як чоловік. А гэто – главнэ. Голодный мужэш буты, нэвыспаный, а форс трыматы шляхта мусыть! (Dykovycʹkyj, 2021, s. 35).

Дзікавіцкі піша пра адчуванне наканавання, з якім жывуць палешукі, трымаючыся правіла: „кожнаму – сваё”.

Всэ, унучку дорогый, всэ. Оджыла я свое вжэ, наробыласа, наплакаласа, навоюваласа... одмучыласа, одным словом. Сылою нэ будэш мылою, люды кажуть. Так шчо колы вжэ жызні я нэ мылая, той нэ буду за йійі – молоду да світлу дівчіну – мусово дэржатыса, зубы стявшы... а костлявымы свойымы рукамы за смэрті рукы кослявыйі оно крэпко, крэпко вхоплюса, коб бронь Божэ, нэ згубытыса по дорозі міжду жызню і смэртю. Горшого нычого ныма – колы і нэ тут вжэ, алэ шчэ і нэ там. (Dykovycʹkyj, 2021, s. 17–18).

Аўтар паказвае шырокі спектр псіхалагічных характарыстык чалавека:

− Гэтуй Толікув швагер, гаёвый, шчо часом навідваетса до нас, всэ хочэ пуказаты, шчо вун ліпшый, чым е на самому ділі!
− А якый вун е? Ну, на самому...
− Ну, говно чоловік, нэ бачыш ты? Злосты повныйі косты в його! (Dykovycʹkyj, 2021, s. 19).

Моўная плынь абразкоў насычана парэміямі, сярод якіх ёсць невядомыя носьбітам беларускай мовы палескія выразы, як напрыклад *Йшов до Пыньска – роскыдвав лупынска. Йшов з Пыньска – збырав лупынска.* Этымалогія і распаўсюджанасць прыказкі звязана з Заходнім Палессем (Брэсцка-пінскім) і падляшскімі гаворкамі Польшчы.

− То ты оно стулько йіды з собой взяв в дорогу? На тры дні?
− Ну, куплю, можэ, шчо в місті тому, як вжэ свое скончытса...
− Дывыса ты – пан якый богатый знайшовса, шчо купляты будэ вун! Нашчо купляты, як свое можна взяты – кумпячка, яйцэ, гурочка, цыбулыну яку пудсылковатыса... Можэ ты шчэ по рэсторанах в тому городі ходытымэш?!

− По рэсторанах то не, алэ в буфеті на вокзалі нішчо мо куплю, пірожка якого...
− От в нас колысь про такых, як ты, шчо мало в дорогу йісты бралы, казалы так: „Йшов до Пыньска – роскыдвав лупынска. Йшов з Пыньска – збырав лупынска”. Так шчо будэш оньдэ нэ піріжкы, а лупынкы йісты за тры дні! (Dykovycʹkyj, 2021, s. 19).

А. Дзікавіцкі фіксуе разуменне важнасці кожнага моманту жыцця, і тых імгненняў, у якія, здаецца, пануе цішыня і нічога не адбываецца. Абразкі „спісаныя” з эпізодаў жыцця і думак вяскоўцаў, але гэта не „чыстыя” адлюстраванні, а зборныя „злепкі” з характарыстык, рыс, думак, паводзін і поглядаў розных людзей. У творчую сувязь уступаюць два бакі суб’ектывацыі – людзі і тое, што аўтар назірае і прапускае праз сваё „Я”. Усё бачанае і пачутае не „запакоўваецца” аўтаматычна ў тэкст, каштоўны матэрыял адбіраецца і „шліфуецца”, насычаецца „кіслародам” эмоцый і інтанацыямі фарбаў.

## 4. Абразок ў часапрасторы

Абразок – гэта не толькі літаратурны жанр, а культурная з’ява, звязаная з пэўным пераходным перыядам – адчувальна новым у гістарычным працэсе краіны ці асабістым жыцці яго стваральніка. Другая палова XX ст. у савецкім кантэксце была эрай падрыхтоўкі граматнага і зацікаўленага чытача. Аналіз мастацкай літаратуры быў неад’емнай часткай школьнай праграмы, і хаця перавага ў любой нацыянальнай школе СССР аддавалася вывучэню рускай літаратуры, гэты час спрыяў фармаванню чытача, зарыентаванага ў літаратурным працэсе. Павышэнню літаратурных кампетэнцый садзейнічалі і негатыўныя з’явы савецкага гандлю – дэфіцыт кніг і магчымаць купіць іх па талонах за здадзеную макулатуру пераводзілі кнігу ў разрад дэфіцытных, а таму запатрабаваных і прэстыжных тавараў. Усё пералічанае садзейнічала таму, што XX ст. сфармавала і выхавала чытача, які браў кнігу з сабой у любое месца, дзе адчувалася сітуацыя магчымай страты часу – у бальніцу, у дарогу, у адпачынак. Пачатак XXI ст. ператварае чалавека ва ўпэўненага карыстальніка камп’ютара і сацыяльных сетак, што вядзе да „нівеляцыі” сфармаванага ў XX ст. тыпу „упэўненага чытача” мастацкай літаратуры. Валодаючы навыкамі пісьма і чытання, і знаходзячыся амаль бесперапынна ў інтэрнэт-прасторы, сучаснік прэферуе кароткія інфармацыйныя тэксты. З’яўленне мабільнай сувязі, інтэрнэту і ютуб-канала дадаюць у камунікацыю *homo socialis* новыя інфармацыйныя вымярэнні і ракурсы бачання свету, а таксама магчымасці самапрэзентацыі. Рэчаіснасць сацыяльных сетак існуе паралельна звыкламу для мінулых стагоддзяў ладу жыцця і шмат у чым яго трансфармуе. Парадаксальна выглядае факт, што ва ўмовах падвойнай жыццёвай прасторы (традыцыйная сацыяльная будзённасць і інтэрнэт з сацыяльнымі сеткамі), жанр абразка актуалізуецца – яго

аб’ём і пачуццёвасць адпавядаюць патрабаванням часу – аб’яднаць у кароткай форме запамінальны пачуццёвы змест. Нараджаюцца „клоны” літаратурнага абразка – пост у Фэйсбуку, допіс у Тэлеграме, скетч у ЦікТоку. Мы разгледзім апошні варыянт, які менш за астатнія нагадвае абразок, і перш за ўсё таму, што існуе не ў пісьмовай форме. Гэтым ён і прыцягвае ўвагу, бо па-сутнасці, аб’ядноўвае класічны абразок, які мае ў беларускай літаратуры стогадовую традыцыю, з кароткай п’есай – той літаратурнай формай, якая побач з абразком стаяла ля вытокаў беларускай літаратуры і на пачатку ХХ ст. таксама па-моднаму называлася абразком.

## 5. Абразок-трансформер – сучасны „клон” літаратурнага абразка ў ЦікТок

ЦікТок – забаўляльная інтэрнэт-пляцоўка ці сацыяльная сетка, створаная ў Кітаі, якая ўвайшла ў міжнародны сегмент ў 2018 г. ЦікТок прызначаны для стварэння і прагляду living рознатэматычных відэа розных жанраў – кароткіх ролікаў ад 15 секунд да 3 хвілін. Вялікая аўдыторыя ЦікТоку значна ўплывае на старыя камунікатыўныя схемы, змяняе правілы выкарыстання традыцыйных маўленчых сродкаў і стварэння тэксту цалкам. У кантэнце ЦікТоку фокус засяроджваецца на жывым маўленні і інтэракцыі аўдыторыі. Папулярнасць скетчаў – кароткіх пастановачных відэа, у якіх абыгрываецца нейкі цікавы момант, абумоўлена паказчыкамі, цалкам уласцівымі для літаратурнага абразка – часавы мінімалізм, цікавостка, эмацыйнасць, лаканізм, запамінальнасць.

Якасць цікток-„прадукта” сярэднестатыстычны чытач мастацкай літаратуры ўспрымае як горшую за якасць друкаванай прадукцыі, і насамрэч, у шматлікіх выпадках гэта так. Здаецца, што літаратурны твор, у адрозненне ад цікток-відэа, здольны да глыбейшай псіхалагічнай фіксацыі жыццёвых момантаў. Але і літаратура, і інтэрнэт прапаноўваюць чытачу/гледачу рознаякасных аўтараў/ціктокераў, адных хочацца перачытваць/пераглядаць, іншых – не. Лепшыя прыклады беларускага сегменту ЦікТоку якасна не горшыя за літаратурныя абразкі. Кейс скетчаў Юркі Максімчыка (maksimurka) (Maksìmčyk, 2025) умоўна можна назваць *Сямейныя гісторыі з дзяцінства*. Ён значна адрозніваецца ад пераважаючага аб’ёму скетчаў, персанажы якіх „крычаць” пастановачнымі рэакцыі і эмоцыямі. У Максімчыка ўсё выглядае нязмушана, яго відэа – сюжэтныя сітуацыі з жыцця беларускай сям’і, увасобленыя поглядам школьніка Юркі. Такім чынам у звароце аўтара да тэмы дзяцінства рэалізуецца рэтраспекцыя, характэрная для традыцыйнага абразка. Аўтар выконвае ў ім тры ролі – бацькі, маці і іх сына – Юркі. Максімчык тонка і з гумарам паказвае псіхалогію чалавека ў яго розных гендарных і сацыяльных ролях, мужчынскую і жаночую псіхалогію, яго героі – звычайныя людзі, у якіх глядач пазнае сваіх родных і знаёмых.

Ва ўменні стварыць зразумелы і пазнавальны псіхалагічны вобраз і палягае поспех Ю. Максімчыка. Паводле яго слоў: „Намацаў рэцэпт – быць сапраўдным. Юра Максімчык – сельскі хлопец, з вёскі Галаўнінцы, што ў Ляхавіцкім раёне. Трасянка – фішачка. Ну і артыстызм з харызмай – на месцы” (Krasovskuj, 2023, I).

ЦікТок-скетч не з’яўляецца тэкстам пісьмовым, але ўсе яго асноўныя рысы дазваляюць нам разглядаць яго ў больш шырокім значэнні як культурны Тэкст, а цікток-скетчы Максімчыка – як Тэкст нацыянальны. Абразок і цікток-скетч маюць агульныя рысы: абсягавы і сюжэтны мінімалізм, лаканічнасць, эмацыйны складнік, адлюстроўваюць цікавыя пачуццёвыя моманты жыцця праз псіхалагічны настрой героя ў пэўнай сюжэтнай замалёўцы.

## Заключэнне

Жанр абразка ляжыць ля вытокаў беларускай літаратуры і паспяхова развіваецца ў наш час, ён аформіўся больш за сто гадоў таму і адносіцца да старэйшых традыцыйных жанраў. Слова *абразок* было надзвычай папулярным у першай трэці XX ст., ім называлі розныя малафарматныя тэксты, перш за ўсё кароткія п’есы. Незанатаванае ў слоўніках слова *абразок* праз актыўны працэс русіфікацыі ў 1970-я гады было заменена прынятым у савецкім літаратуразнаўстве шырокім тэрмінам *мініяцюра*, і, не зважаючы на глыбока нацыянальны характар, не заняло ўстойлівай тэрміналагічнай пазіцыі. Вяртанне яго тэрміналагічнай функцыі фіксуе Вячаслаў Рагойша ў сваім *Школьным тэрміналагічным слоўніку* (Ragojša, 2009, s. 3–4), але ў літаратурнай крытыцы з яго ўжываннем і цяпер не ўсё адназначна.

З лексічнага пункту гледжання слова мініяцюра ў беларускай мове – такое ж даўняе запазычанне, як і ў іншых славянскіх мовах, таму яго ўжыванне ў літаратуразнаўстве апраўдана ў якасці агульнага тэрміну для кароткіх мастацкіх тэкстаў, але поўнае атаясамленне мініяцюры з абразком “распушчае” абразок у віры жанру, які, і праз шматлікія спробы яго асэнсавання на працягу стагоддзя, застаецца шырокім паняццем. Мы разглядаем жанр абразка як малы лірычны твор, замалёўку, у якой сюжэт толькі пазначаны, але не разгорнуты, ці зусім адсутнічае; твор, які адлюстроўвае свет пачуццяў, эмоцый, успамінаў і алюзій; гэта адзін з відаў мініяцюры, найменшы паводле абсягу, які можа складацца з некалькіх сказаў і зрэдку перавышае адну старонку тэксту. Зыходзячы з ідэі В. Рагойшы аб магчымасці графічнага ўвасаблення лірыкі і паэзіі ў выглядзе дзвюх акружнасцей, што перасякаюцца паміж сабой (Ragojša, 2009, s. 87), жанр абразка мы разглядаем як кароткую празаічную форму, здольную набліжацца да вершаванай і ўвасабляцца ў версэт.

Малыя празаічныя творы ў кожнай нацыянальнай традыцыі маюць уласныя характарыстыкі, іх узнікненне звязана, як правіла, з пачаткамі нацыянальнай

літаратуры, пра што сведчыць вопыт беларускі, польскі, чэшскі і ўкраінскі. Заканамернасць такой „кропкі адліку" падвярджае А. Дзікавіцкі – зварот да абразка „нованароджанага" пісьменніка, які з'яўляецца прадстаўніком несфармаванай мікралітаратуры Заходняга Палесся – надзвычай удалы крок. Ён сведчыць пра пераемнасць традыцыі абразка ў новых умовах і новым кантэксце заходнепалескай мікралітаратуры. Сярод „абразкоўцаў" А. Дзікавіцкі найбольш блізкі да Бядулевага разумення і ўвасаблення гэтага жанру, абразкі абодвух аўтараў – узоры своеасаблівага сузіральнага медытавання, не перагружаныя інфарматыўнасцю, сувязь паміж падзеявай і пачуццёвай лініяй заснавана на лірычна-філасофскіх нотах успрымання рэчаіснасці, у Дзікавіцкага завершанасць абразкоў часта дасягаецца з дапамогай аўтарскай "інкрустацыі" – лёгкага, ледзь улоўнага гумару.

У параўнанні са З. Бядулем Брыль і іншыя прадстаўнікі літаратурных мікратэкстаў выглядаюць эксперыментатарамі, што ў сувязі з няўстойлівай структурай жанру заканамерна. Я. Брыль знайшоў сябе ў мініяцюры і прыстасаваў жанр пад сябе, развіў яго ў рэчышчы сваёй аўтарскай стылістыкі. Яго творчасць – добры прыклад таго, як кожны літаратурны жанр з часам здольны набываць новыя формы.

Змены камунікатыўных фарматаў і стратэгій, якія адбыліся пад уплывам сацыяльных сетак, выклікалі да жыцця новыя тыпы мікратэкстаў. Да такіх адносіцца *цік-ток-скетч*, які мае з абразком функцыянальна падобную нагрузку і ўплывовы патэнцыял на адрасную аўдыторыю. Папулярны ў ЦікТоку кантэнт Ю. Максімчыка сведчыць пра запатрабаванасць перш за ўсё ўнікальнага, якаснага прадукту – ні беларуская мова, ні каларытная трасянка не з'яўляюцца перашкодай для падпісчыкаў Максімчыка з іншых краін. Аналагічная сітуацыя ў А. Дзікавіцкага, ён прыцягвае ўвагу патэнцыйнага чытача-аўтахтона – жыхара Заходняга Палесся, а разам з тым і чытача, "няўпэўненага" ў сваёй палескай моўнай кампетэнтнасці – беларуса і ўкраінца, для абодвух нацыянальных аўдыторый мова А. Дзікавіцкага зразумелая, таксама як і апісаныя сітуацыі, што падцвярджаецца шматлікімі аўтарскімі прэзентацыямі як у беларускай аўдыторыі ў розных еўрапейскіх краінах, так і ва Украіне.

Разгледжаная намі традыцыя беларускага абразка і яе сучаснае ўвасабленне сведчыць пра пераемнасць у развіцці жанру не толькі ў літаратурным асяроддзі, але і на пляцоўках сацыяльных сетак. Гэта беларуская традыцыя з'яўляецца нацыянальным складнікам больш шырокай – светавай традыцыі малых празаічных форм.

## REFERENCES / BIBLIOGRAFIA

Astaf′ev, Viktor. (2008). *Tetrad′ 1. Padenie lista. Zatesi*. Moskva: Èksmo. [Астафьев, Виктор. (2008). *Тетрадь 1. Падение листа. Затеси*. Москва: Эксмо].

Bryl′, Ânka. (1997). *Dze skarb vaš: lìryčnaâ proza*. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura. [Брыль, Янка. (1997). *Дзе скарб ваш: лірычная проза*. Мінск: Мастацкая літаратура.

Bryl′, Ânka. (1981). *Zbor tvoraй u 5 t.*, t. 5: *Lìryčnyâ abrazkì ì mìnìâcûry*. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura. [Брыль, Янка. (1981). *Збор твораў у 5 т.*, т. 5: *Лірычныя абразкі і мініяцюры*. Мінск: Мастацкая літаратура.

Bâdulâ, Zmìtrok. (1986). *Zbor tvoraй. u 5 t.*, t. 2: *Veršy ŭ proze. Lìryčnyâ ìmprèsìì. Apavâdannì*. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura. [Бядуля, Змітрок. (1986). *Збор твораў. у 5 т.*, т. 2: *Вершы ў прозе. Лірычныя імпрэсіі. Апавяданні*. Мінск: Мастацкая літаратура]. Pobrano z: https://knihi.com/Zmitrok_Biadula/Abrazki.html (dostęp: 10.08.2025).

Vol′skì, Vìtal′. (1966). Pra Zmìtraka Bâdulû. *Maladosc′*, 4, s. 91–95. [Вольскі, Віталь. (1966). Пра Змітрака Бядулю. *Маладосць*, 4, с. 91–95].

Gìnda, Olena. (1999). Prozova mìnìatûra v kontekstì shìdnoslov'âns′koï lìteraturoznavčoï žanrologìï (60–80-tì roku XX st.). *Problemy slov′ianoznavstva*, 50, s. 111–117. [Гінда, Олена. (1999). Прозова мініатюра в контексті східнослов'янської літературознавчої жанрології (60–80-ті роки XX ст.). *Проблеми слов'янознавства*, 50, с. 111–117].

Dvorkìna, Ûlìâ. (1940). Tvorčasc′ Zmìtraka Bâdulì (Da 30-goddzâ lìtaraturnaj dzejnascì). *Polymâ rèvolûcyì*, 9–10, s. 15–51. Дворкіна, Юлія. (1940). Творчасць Змітрака Бядулі (Да 30-годдзя літаратурнай дзейнасці). *Полымя рэволюцыі*, 9–10, с. 15–51.

Dykovyc′kyj, Oleksìj. (2021). *On'dè*. Varšava. [Дыковыцькый, Олексій. (2021). *Оньдэ*. Варшава].

Dynnik, Valentina. (1925). Miniatûra. *Literaturnaâ ènciklopediâ: Slovar' literaturnyh terminov v 2 t.*, t. 1: *A–P*. Moskva, Leningrad.: Izd-vo L. D. Frenkel′. [Дынник, Валентина. (1925). Миниатюра. *Литературная энциклопедия: Словарь литературных терминов в 2 т.*, т. 1: *А–П*. Москва, Ленинград: Изд-во Л. Д. Френкель].

Èpštejn, Mihail. (2024). Eženedel′nyj leksikon Mihaila Èpštejna. *Dar slova,* 434(513). [Эпштейн, Михаил. (2024). Еженедельный лексикон Михаила Эпштейна. *Дар слова,* 434(513)].

Haŭstovìč, Mìkola. (2018). *Dasledavannì ì matèryâly: lìtaratura Belarusì kanca XVIII–XIX stagoddzâ*, t. 4. Warszawa: Katedra Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego]. [Хаўстовіч, Мікола. (2018). *Даследаванні і матэрыялы: літаратура Беларусі канца XVIII–XIX стагоддзя*, т. 4. Warszawa: Katedra Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego].

Kazloŭskì, Ruslan. (2008). Mìnìâcûra ŭ mastackaj proze Fëdara Ânkoŭskaga. *Melodii, kraski, zapahi "maloj rodiny" Adama Mickeviča* (s. 300–305). Grodno: GrGU. [Казлоўскі, Руслан. (2008). Мініяцюра ў мастацкай прозе Фёдара Янкоўскага. *Мелодии, краски, запахи "малой родины" Адама Мицкевича* (с. 300–305). Гродно: ГрГУ].

Kìslìcyna, Ganna. (2000). *Lìryčnaâ mìnìâcûra âk žanr belaruskaj lìtaratury*. Mìnsk: Belaruskaâ navuka [Кісліцына, Ганна. (2000). *Лірычная мініяцюра як жанр беларускай літаратуры*. Мінск: Беларуская навука].

Kalesnìk, Uladzìmìr. (1975). *Zorny speй*. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura. [Калеснік, Уладзімір. (1975). *Зорны спеў*. Мінск: Мастацкая літаратура].

Keda, Al′žbeta. (2017). *Ščonaйskìâ abrazkì: knìga prozy*. Grodna: ÛrsaPrynt. [Кеда, Альжбета. (2017). *Шчонаўскія абразкі: кніга прозы*. Гродна: ЮрсаПрынт].

Kolas, Âkub. (2007). *Zbor tvoraŭ: u 20 t.*, t. 2: *Veršy 1911–1938*. Mìnsk: Belaruskaâ navuka. [Колас, Якуб. (2007). *Збор твораў: у 20 т.*, т. 2: *Вершы 1911–1938*. Мінск: Беларуская навука].

Krasovskij, Il'â. (2023). Ûrka Maksìmčyk. Zalâceŭ u trèndy. Âk avìâìnžyner staŭ zorkaj TikTok. *Naša Nìva*, 11.09.2023. [Красовский, Илья. (2023). Юрка Максімчык. Заляцеў у трэнды. Як авіяінжынер стаў зоркай TikTok. *Наша Ніва*, 11.09.2023]. Pobrano z: https://nashaniva.com/326181 (dostęp: 10.08.2025).

Lebedeva, Marina. (2017). Žanr miniatûry i ego interpretaciâ v sovremennom mediaprostranstve. V: *Mediaprostranstvo Belarusi: istoriâ i sovremennost' (k 100-letiû gazety «Zvâzda» i 90-letiû gazety «Sovetskaâ Belorussiâ»*) (s. 115–118). Minsk: Izd. centr BGU. [Лебедева, Марина. (2017). Жанр миниатюры и его интерпретация в современном медиапространстве. В: *Медиапространство Беларуси: история и современность (к 100-летию газеты «Звязда» и 90-летию газеты «Советская Белоруссия»)* (с. 115–118). Минск: Изд. центр БГУ].

Lìčbavaâ bìblìâtèka POLONA. [Лічбавая бібліятэка POLONA. (2025)]. Pobrano z: https://polona.pl/ (dostęp: 10.08.2025).

Maksìmčyk, Ûrka. (2025). *Ûtub-kanal Maksimurka*. [Максімчык, Юрка. (2025). *Ютуб-канал Maksimurka*]. Pobrano z: https://www.youtube.com/channel/UCgATTz1QolAzl-w9y8H5ENtA (dostęp: 10.08.2025).

Ragojša, Vâčaslaŭ. (2009). *Škol'ny lìtaraturaznaŭčy sloŭnìk*. Mìnsk: Narodnaâ asveta. [Рагойша, Вячаслаў. (2009). *Школьны літаратуразнаўчы слоўнік*. Мінск: Народная асвета].

Sadko, Liudmila. (2022). Polìsìstèmnasc′ u lìtaraturna-krytyčnyh artykulah ì rannâj lìrycy Z. Bâdulì. *Vestnik BarGU. Seriâ: Pedagogičeskie nauki. Psihologičeskшe nauki. Filologičeskie nauki (Literaturovedenie)*, 1, s. 94–101. [Садко, Людміла. (2022). Полісістэмнасць у літаратурна-крытычных артыкулах і ранняй лірыцы З. Бядулі. *Вестник БарГУ. Серия: Педагогические науки. Психологические науки. Филологические науки (Литературоведение)*, 1, с. 94–101].

Sìvèk, Beata. (2003). Svet lìryčnyh mìnìâcûr Zmìtraka Bâdulì. *Roczniki Humanistyczne,* 51(7), s. 131–139. [Сівэк, Беата. (2003). Свет лірычных мініяцюр Змітрака Бядулі. *Roczniki Humanistyczne*, 51(7), с. 131–139].

Skrygan, Ân. (1985). *Vybranyâ tvory: u 2 t.*, t. 1: *Krugì: Apovesc'*. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura. [Скрыган, Ян. (1985). *Выбраныя творы: у 2 т.*, т. 1: *Кругі: Аповесць*. Мінск: Мастацкая літаратура]. Pobrano z: https://knihi.com/Jan_Skryhan/Kruhi.html (dostęp: 10.08.2025).

Skrygan, Ân. (1981). *Hači, kab vy stalì dobrym pìs'mennìkam*. [Скрыган, Ян. (1981). *Хачу, каб вы сталі добрым пісьменнікам*]. Pobrano z: https://knihi.com/Jan_Skryhan/Chacu,_kab_vy_stali_dobrym_pismiennikam.html (dostęp: 10.08.2025).

*Tlumačal'ny sloŭnìk belaruskaj movy: u 5 t.* (1977). t. 1: *A–V*. Belaruskaâ Saveckaâ Èncyklapedyâ ìmâ P. Broŭkì. [*Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т.* (1977). т. 1: *А–В*. Мінск: Беларуская Савецкая Энцыклапедыя імя П. Броўкі].

*Tlumačal'ny sloŭnìk belaruskaj movy: u 5 t.* (1978). t. 2: *G–K*. Belaruskaâ Saveckaâ Èncyklapedyâ ìmâ P. Broŭkì. [*Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т.* (1978). т. 2: *Г–К*. Мінск: Беларуская Савецкая Энцыклапедыя імя П. Броўкі].

Faŝenko, Vasìl′. (2005). *U glibinah lûds'kogo buttâ (Lìteraturoznavčì studìï)*. Odesa: Maâk. [Фащенко, Васіль. (2005) *У глибинах людського буття (Літературознавчі студії).* Одеса: Маяк].

SUBMITTED: 2024.03.20
ACCEPTED: 2025.07.11
PUBLISHED ONLINE: 2026.01.30

## ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

**Inna Kalita / Іна Каліта** – Czechy, Instytut Białoruski w Pradze, dr., *specjalność*: literaturoznawstwo i lingwistyka, *zainteresowania naukowe*: komparatystyka literacka i językowa, kulturologia, frazeologia, realizm magiczny.

*Adres*: Hornická 13, 400 11 Ústí nad Labem, Česká Republika

*Wybrane publikacje:*

1. Kalita, Inna. (2017). *Česko-běloruský frazeologický slovník*. Ústí nad Labem: PF UJEP.
2. Каліта, Іна. (2019). *Фразеалагічныя інавацыі ў люстэрку інтэрнэту*. У: Іна Каліта, Наталля Сівіцкая, Вольга Ляшчынская. *Беларуская мова ў люстэрку традыцый і інавацый* (с. 3–42). Ústí nad Labem: PF UJEP.
3. Каліта, Іна. (2021). Сіні колер ў фразеалагічнай карціне свету беларусаў і чэхаў. *Studia Białorutenistyczne,* 15, с. 291–309.
4. Каліта, Іна. (2023). Залацінкі з куфэрку Заходняга Палесся. Ішоў да Пінска (Мінска) – раскідваў лупінска. Ішоў з Пінска (Мінска) – збіраў лупінска. У: *Славянская фразеология и паремиология*, вып. 3 (с. 107–114). Гомель: ГГУ им. Ф. Скорины.
5. Каліта, Іна. (2024). Казкі Філіпа Гаспадарова – рэцэпцыі і псіхалагічныя праекцыі. У: *Казка і міф у еўрапейскай прасторы 3: традыцыі і навацыі* (с. 44–50). Мінск: Беларуская навука.